Ларыса Ганчарык

# ЗАХОПЛЕНЫЯ ГІТАРАЙ...

**У сярэдзіне лютага ў старым рускім горадзе Варонежы адбыўся I Міжнародны конкурс юных выканаўцаў на класічнай гітары.**

Хто б мог падумаць, што пасярод разбуранай, раз'яднанай Расіі, якая знаходзіцца ў стане глыбокага эканамічнага крызісу, магчыма такая падзея! А чаму менавіта ў Варонежы? Здавён гэты горад славіцца сваімі музычнымі традыцыямі. Тут жыве і працуе вядомы ў краіне гітарыст Сяргей Кардзенка. Менавіта яму належыць ідэя арганізацыі конкурсу. Але, як вядома, ад ідэі да яе ўвасаблення — дыстанцыя вялікага памеру. І невядома, колькі б яшчэ гэтая высакародная ідэя лунала ў паветры, калі б лёс не прывёў С. Кардзенку да дырэктара акцыянернага таварыства «САН» Мікалая Алёхіна, які стаў генеральным спонсарам творчага спаборніцтва. Адбыўся цуд: прадстаўнікі мастацтва і бізнесу выйшлі на прамы кантакт без удзелу старых кіруючых структур — міністэрстваў, упраўленняў. І ў выніку ідэя набыла годнае ўвасабленне. Уражвала вельмі добрая арганізацыя конкурсу. Усё было прадумана да драбніц, пачынаючы ад бясплатнага харчавання і пражывання ўдзельнікаў і канчаючы грашовымі прэміямі пераможцам. На кожным кроку адчуваўся клопат прадстаўнікоў фірмы «САН», якая прадугледзела нават перакладчыкаў, фатографаў і шмат іншага. Да правядзення конкурсу прыклалі руку таксама «Крэдытпрамбанк», канцэрн «Энергія», Варонежская гандлёвая біржа, Маскоўскі гандлёвы дом, Цэнтральны райвыканкам Варонежа і інш.

Конкурс праходзіў у два туры па дзвюх узроставых групах: малодшая — да 14 гадоў, старэйшая — да 17. Наколькі мне вядома, яшчэ нідзе і ніколі на міжнародным узроўні не спаборнічалі гітарысты такога ўзросту. Для ўдзелу ў конкурсе неабходна было даслаць касету з запісам конкурснай праграмы. На падставе запісаў рабіўся допуск канкурсантаў. Той, хто вытрымаў першае выпрабаванне, атрымаў запрашэнне на конкурс і два абавязковыя творы, адзін з якіх удзельнік абавязаны быў развучыць у месячны тэрмін.

На першым конкурсным этапе пашанцавала далёка не ўсім. З больш чым ста жадаючых, даслаўшых заяўкі (разам з касетамі), было дапушчана 25 чалавек малодшай групы і 18 старэйшай. Абавязковыя п'есы для кожнай узроставай групы напісалі кампазітар і гітарыст Мікіта Кошкін і старшыня Варонежскага аддзялення Саюза кампазітараў Міхаіл Цайгер.

У журы ўвайшлі вядомыя кампазітары і выканаўцы Уладзімір Тэрво, Павел Даўгаполы, Сяргей Кардзенка, аўтары абавязковых п'ес, прафесар з Германіі Рэйнберг Эверс, кампазітар і гітарыст з Бельгіі Норбер Леклер, прафесар Кембрыджскага універсітэта намеснік рэдактара часопіса «Класічная гітара» Крыс Кілвінгтан. Узначаліў журы знакаміты рускі музыкант і педагог, лаўрэат міжнароднага конкурсу Аляксандр Фраучы.

І вось наступіў доўгачаканы момант урачыстага адкрыцця конкурсу. З густам аформлена зала музычнага вучылішча. Залатая карона ўпрыгожвае сілуэт гітары на сцэне. Яна на нейкі час стала царыцаю музыкі: ёй пакланяюцца, яе заваёўваюць, ёю захапляюцца...

Ужо першае праслухоўванне канкурсантаў малодшай групы ашаламіла прысутных. Такога высокага выканальніцкага ўзроўню ніхто не чакаў. Норбер Леклер прызнаўся, што вельмі здзіўлены, бо нідзе і ніколі не бачыў такой колькасці здольных дзяцей. Малодшая група, па яго меркаванню, — «гэта дзеці вялікага тэмпераменту і музычных магчымасцей».

Работа журы ўскладнялася яшчэ і тым, што ў спаборніцтве ўдзельнічалі дзеці старшыні журы і яго намесніка — Антон Фраучы і Леанід Тэрво. Сітуацыя, прама скажам, далікатная. І тут сапраўды магчымы перакосы, чаго, па меркаванню некаторых, не ўдалося пазбегнуць. Аднак як Антон, так і Леанід маюць права займацца ў сваіх знакамітых бацькоў і ўдзельнічаць у конкурсах. На жаль, музычныя спаборніцтвы любога рангу часта цярпяць ад прадузятасці членаў журы. У гэтым сэнсе вельмі прыцягальная сістэма судзейства ў спартсменаў, напрыклад фігурыстаў, калі арбітры адразу ж пасля выступлення выстаўляюць свае адзнакі. Усе бачаць, хто з арбітраў каму і за што падсуджвае, калі гэта так. Настаў час і музыкантам узяць на ўзбраенне галоснасць.

Павінна заўважыць, што на конкурсе было шмат такіх прыкладаў: бацька — педагог свайго дзіцяці. Значная колькасць канкурсантаў — выхадцы з музычных сем'яў. Такую з'яву можна толькі вітаць.

І вучні не падвялі. Яны былі цудоўныя! Ні з чым не параўнальную радасць адчуваеш,

Уладзімір Сцяпура.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

калі бачыш і чуеш дзяцей, якія цудоўна іграюць. Самай юнай удзельніцы конкурсу Ірынцы Цясленка з горада Сасновы Бор усяго восем гадоў! І не бяда, што «Тонкая рабіна» Іванова-Крамскога яшчэ вельмі складаная для яе, што яна не дарасла да другога тура. Пасля яе выступлення зала выбухнула апладысментамі. Гэта самая вялікая перамога самай маленькай удзельніцы.

Антон Фраучы паказаў аб'ёмную, разнастайную (тры творы — з іх два абавязковыя ў першым туры) і добра выкананую праграму. Яго ігра вызначалася найбольшай стабільнасцю і стылявой разнапланавасцю. Вельмі спадабалася яго не па-дзіцячы сур'ёзнае выкананне Прэлюдыі №1 Віла Лобаса, для якой была знойдзена ўдалая трактоўка. Увогуле, для Антона характэрныя тэхнічная свабода, выканальніцкая культура, музыкальнасць. У выніку — першае месца. І гэта па заслугах.

З першага тура звярнуў на сябе ўвагу Саша Краўцоў з Набярэжных Чалноў. Добра падрыхтаваны, ён вылучаўся салідным, удумлівым падыходам да выканання «Фантазіі» Х. Віньянса, прадэманстраваў пры гэтым цудоўнае трэмала. Знаўцы адзначаюць багаты, мяккі гук А. Краўцова, акуратнасць, адточанасць, змястоўнасць яго ігры. Ён таксама стаў уладальнікам першай прэміі.

Другое месца засталося вольным.

Чароўных дзетак Алёшу і Кацю Хоравых прывезлі іх бацькі з Санкт-Пецярбурга. Незвычайную віртуознасць прадэманстраваў Алёша. Дастаткова прыгадаць такія рэчы з яго праграмы, як Вальс № 3 Барыуса, эцюд «Калібры» Д. Сагрэраса — творы, падуладныя не кожнаму даросламу музыканту; адоранасць хлопчыка не выклікае сумненняў. Аднак тата-педагог крыху перастараўся з праграмаю «навырост». У другім туры тэхнічная беглаcць Алёшы была яўна на мяжы. Тым не менш у яго трэцяе месца.

Беларусь была прадстаўлена трыма гітарыстамі. Усе яны з Мінска, прычым двое — Ян Скрыган і Максім Таіраў — вучні Першай музычнай школы імя Л. Александроўскай. Ян і Максім ужо маюць вопыт конкурснай барацьбы — яны лаўрэаты рэспубліканскага конкурсу імя Жыновіча. Наколькі мне вядома, з нашай рэспублікі былі яшчэ заяўкі на конкурс, але заяўнікі не прайшлі касетнага адбору. Трое ўдзельнікаў прайшлі на другі тур і на агульным фоне выглядалі даволі прыстойна. Найбольш удалым было выступленне Яна Скрыгана (педагог М. Шыла). Яму ўдалося заняць пятае месца і атрымаць званне лаўрэата. Унук беларускага пісьменніка, узгадаваны ў музыкальнай сям'і, Ян прымусіў гаварыць пра сябе адразу пасля першага тура. Яго ігра прываблівае цеплынёй, мяккасцю, завершанасцю. Ужо ў гэтым узросце Я. Скрыган мае свой непаўторны почырк, у ім праглядаецца тонкі, удумлівы, сур'ёзны музыкант, здольны да глыбокага аналізу. Яго ігра вызначаецца здзіўляючай логікай, выверaным гукам, уменнем слухаць сябе і зачараваць залу. Строга, акуратна, з прадуманай трактоўкай і выразным кантрастам паміж часткамі прагучалі шэсць п'ес для лютні старадаўняга аўтара В. Галілея. Лёгка, натуральна, у рытмічна завостраным ключы падаў выканаўца «Нябеснае танга» Р. Доўэнса. Пачатак быў шматабяцаючы. Аднак у другім туры натхненне здрадзіла Яну. І гэта сведчыць пра тое, наколькі непрадказальны лёс музыканта, як ён залежыць ад знешніх абставін, асабістага настрою, эмацыянальнага стану. На наш погляд, на заключным этапе Яна падвяла праграма. Іграць у другім туры ў якасці п'есы па выбару Бурэ і дубль Баха (зноў поліфанію) — тут педагог яўна перамудрыў. Яркая п'еса іспанскага ды сучаснага аўтара замест Баха дазволіла б Яну раскрыцца паўней і заняць больш высокае месца.

Поўная супрацьлегласць Яну — Максім Таіраў (педагог У. Бельшаў). Ён вызначаецца жвавасцю характару, аптымізмам, эмацыянальнасцю, і гэтыя якасці ў поўнай ступені выявіліся ў ягоным выкананні. Максіму ўласцівы валявы пачатак, артыстызм, моцны, шчыльны гук. Таму «Нябеснае танга» Р. Доўэнса прагучала больш напорыста, чым у Яна, у танцавальных традыцыях жанру. На мой погляд, далейшая сур'ёзная, мэтанакіраваная работа Максіма над якасцю гуку, выканаўчымі дэталямі адкрые перад ім новыя творчыя далягляды. Пераканаўча, натхнёна прагучала на конкурсе Прэлюдыя №1 Вілы Лобаса, у той час як «Менуэт» Сора і «Павана» Мілана —



Максім Таіраў.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

гэта творы, з якіх ён даўно ўжо вырас і якія не дазволілі яму падняцца да звання лаўрэата.

Яшчэ адзін прадстаўнік Мінска — Уладзімір Сцяпура. Таксама займаецца ў У. Белышава, але ўжо ў музычным вучылішчы, таму выступаў у старэйшай групе. Валодзю выпала нялёгкая місія адкрываць абодва туры. Нягледзячы на гэта ён паспяхова справіўся са сваёй задачай і ўпэўнена прайшоў другі тур. У яго цікавая, з густам падабраная праграма. Дастаткова выразна прагучала ў яго выкананні мяккая, паэтычная «Фантазія» Вайса. Праўда, тут хацелася б адчуць больш свабоды голасавядзення. Удала перададзены незвычайны, фантастычны характар Эцюда № 20 сучаснага кубінскага кампазітара Лео Браўэра. І, вядома ж, запомнілася цудоўная, гордая «Андалузія» Фартэа, у якой Валодзя паказаў годнае выкананне твора складанай формы з вытанчанай рытмікай фламенка. Увогуле, для У. Сцяпуры характэрна па-акадэмічнаму строгая манера ігры, у якой пакуль пераважае воля педагога. Калі улічыць, што ён адносна нядаўна займаецца музыкай, дык гэта добры вынік і адначасова старт у будучыню, да большай творчай свабоды.

Абсалютным лідэрам у старэйшай групе, без сумнення, быў Іван Нікалаеўскі з Магнітагорска. У свае 15 гадоў — гэта надзвычай адораны самародак. У яго вельмі багаты ўнутраны свет. І гэта ён цалкам рэалізуе ў музыцы.

Другой прэміі ў старэйшай групе ўдастоены Аляксандр Саколкін з Екацерынбурга. Гэта надзвычайны музыкант, які вызначаецца строгасцю, фундаментальнасцю, стабільнай падрыхтоўкай. У яго цікавая і салідная праграма.

Адзіная замежная ўдзельніца конкурсу Алена Міташава з Брно (Чэха-Славакія) удастоена трэцяй прэміі. Яна валодае мяккім гукам, культурай выканання. Але ігра яе падалася крыху прэснай і аднастайнай. На думку многіх спецыялістаў, яна значна прайграе нашым музыкантам.

Хацелася б сказаць пра аднаго «пераможцу», які, нягледзячы на сталы ўзрост, удастоіўся самай вялікай узнагароды — усеагульнай любові і прызнання. І не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі. На гітарным небасхіле ён — зорка першай велічыні. Мікіта Кошкін — з'ява унікальная. Шчасліва спалучаючы ў сабе таленты гітарыста і кампазітара, ён дорыць выканаўцам цудоўны, арыгінальны рэпертуар.

Конкурс, які адбыўся, дапамог выяўленню здольных дзяцей. Свет пачуў іх імёны. Акрамя таго конкурс з'явіўся паказчыкам узроўню педагагічнага майстэрства, стану нацыянальных гітарных школ. У дадзеным выпадку відавочнае лідэрства належыць Маскве, Санкт-Пецярбургу, Украіне.Масквічы вызначыліся не толькі ў рамках конкурсу, але і, так бы мовіць, у паказальных выступленнях. Праграма спаборніцтва была гранічна насычанай і акрамя абавязковых праслухоўванняў, уключала вячэрнія канцэрты, дзе выступалі такія карыфеі гітарнай музыкі, як А. Фраучы, У. Тэрво, У. Дацэнка і госць з Бельгіі Норбер Леклер. На вячэрніх канцэртах мы таксама мелі магчымасць пачуць вучняў А. Фраучы — Яўгена Фінкельштэйна, Уладзіміра Міцякова (Масква), Вадзіма Кузняцова (Разань,) Дзмітраса Рэгінаса (Кіпр), Ангела Кастадзінава (Балгарыя). Усе яны вучыліся ці вучацца ва Усерасійскай акадэміі музыкі (былы інстытут імя Гнесіных). Нягледзячы на сваю маладосць, кожны з іх сталы ўжо музыкант, здатны да самастойнай канцэртнай дзейнасці.

Што да Беларусі, то наша гітарная школа крыху саступае ўкраінскай і расійскай, хоць у нас ёсць многае: здольныя дзеці, вялікая любоў і цяга да гітары ў розных колах грамадства, традыцыйныя фестывалі і конкурсы, што выяўляюць таленты і стымулююць гітарнае выканальніцтва. Аднак усё гэта мы не можам прыстойна выкарыстоўваць з-за недастаткова развітой гітарнай педагогікі. Педагогікі, якой даўно ўжо валодаюць фартэпіянная, скрыпічная, цымбальная школы. Чаму б не ўзяць у гэтых школ тое, што ляжыць на паверхні, іх карысны і бясцэнны вопыт? Або хоць бы шырэй укараняць на практыцы ўжоназапашаныя метадычныя распрацоўкі? Інертнасць нашага мыслення, адсутнасць зацікаўленага пошуку, а часам проста добрасумленнай працы не дазваляюць нам быць у ліку першых.

Варонежскі конкурс выявіў дзве акалічнасці, пра якія нельга не сказаць. Першая і галоўная — тое, што у краінах Садружнасці гітара ў сваім развіцці ідзе сяміміль-

Ян Скрыган.



нымі крокамі. І гэты бурны гітарны рост значна пераўзыходзіць агульнаеўрапейскі узровень. Сёння, бадай, лягчэй стаць лаўрэатам якога-небудзь заходняга конкурсу, чым нашага ўнутранага. Прычым дадзены конкурс — далёка не поўнае адлюстраванне стану гітарнага выканальніцтва. 43 удзельнікі абедзвюх узроставых груп — гэта даволі мала для такой краіны, як былы Саюз. Многія з патэнцыяльных удзельнікаў позна даведаліся пра конкурс.

Другая акалічнасць звязана з тым, што на такім высокім фоне, на жаль, яшчэ ёсць дрэнна пастаўленыя рукі, малапрафесійнае навучанне дзяцей, кепскія інструменты. У сувязі з гэтым не можа не хваляваць лёс нашых юных музыкантаў. Ці змогуць яны з максімальнай паўнатой рэалізаваць свой талент? Ці не падсячэ їм крылы наша архіскладанае жыццё?

Першы міжнародны конкурс юных выканаўцаў на класічнай гітары завершаны. Падведзены вынікі. Шчыра кажучы, калі не лічыць адзіную замежную ўдзельніцу, то міжнародным на конкурсе было ў асноўным журы. Што ж датычыць замежных выканаўцаў, то яны спалохаліся эканамічнага развалу і палітычнай нестабільнасці ў былым СССР і таму на конкурс не прыехалі. У аргкамітэце я даведалася, што былі заяўкі з Японіі, Кітая, Тайваня і інш., але яны не мелі практычнага пацвярджэння.

У перапынку паміж конкурснымі праслухоўваннямі мне давялося пагутарыць з членам журы, нашым госцем з Германіі, панам Эверсам.

— Пан Эверс, што вы можаце сказаць з нагоды цяперашняга конкурсу? Ці даводзілася вам назіраць нешта аналагічнае ў другіх краінах?

— Напэўна, не. Дадзены конкурс — унікальная падзея па сваёй арганізацыі і па ўзроўню выканання.

— Ці карыстаецца гітара папулярнасцю ў вашай краіне, ці прэстыжная прафесія гітарыста ў Германіі?

— Гэта вельмі складанае пытанне. Зараз многія аддаюць перавагу фартэпіяна, скрыпцы...

— Ваша імя ў нас добра вядома і ў асяроддзі музыкантаў вымаўляецца з вялікай павагай. Факт вашай прысутнасці тут у такі складаны час сведчыць пра тое, што вы не толькі цудоўны музыкант, але і смелы чалавек. Вас не напужала крызісная сітуацыя ў былым Саюзе?

— О, мне вельмі непрыемна згадваць той час (80-ыя гады), калі я прыязджаў сюды і не мог зрабіць нават кроку з-за вашай поўнай ізаляванасці ад знешняга свету. Гэта моцна ўскладняла ўзаемаадносіны з музыкантамі. Тады я лічыў вас, прабачце, краінай трэцяга свету. Цяпер — зусім іншая справа! Я і мае калегі можам размаўляць з кім хочам, ісці куды хочам — ніхто нічога не забараняе. За такі кароткі час у вас адбыліся вялікія змены. І калі зараз, нягледзячы на эканамічны крызіс, вы праводзіце такі салідны конкурс, — у вас ёсць будучыня!

З гэтымі словамі нельга не пагадзіцца.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ